АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

# Дакладна, зладжана, арганізавана

## Так ацанілі ход электаральнай кампаніі ў Асіповічах міжнародныя назіральнікі ад місіі СНД

**Прадстаўнікі місіі міжнародных назіральнікаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў прынялі ўдзел у пасяджэнні акруговай камісіі № 89 у Асіповічах Магілёўскай вобласці, на якім было разгледжана пытанне па рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты ў парламент і ў Глускую выбарчую акругу № 45.**

Па словах старшыні акруговай выбарчай камісіі № 89 **Юрыя ДАНЯНКОВА**, усе арганізацыйныя практычныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да электаральнай кампаніі праведзены. Да Асіповіцкай выбарчай акругі № 89 адносяцца тры раёны — Асіповіцкі, Глускі і Клічаўскі, і, адпаведна, райвыканкамамі гэтых раёнаў прынятыя ўсе неабходныя рашэнні. У прыватнасці, створаны 66 участкаў для галасавання, яны размешчаны ў агульнадаступных месцах, абсталяваны неабходнай мэбляй і аргтэхнікай, арганізаванае безбар'ернае асяроддзе. На гэтым тыдні пройдуць першыя арганізацыйныя пасяджэнні ўчастковых выбарчых камісій і яны пачнуць сваю работу.

— Дакументы, якія былі пададзены ў нашу акруговую выбарчую камісію № 89 для рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты, правераны ў адпаведных дзяржорганах на адпаведнасць выбарчаму заканадаўству, — удакладніў Юрый Данянкоў. — Можна казаць, што этап па рэгістрацыі ў кандыдаты на дэпутацкі мандат намі завершаны.

Па словах старшыні акруговай выбарчай камісіі, электаральная кампанія праходзіць спакойна, акруговая камісія працуе ў адпаведнасці з календарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па правядзенні адзінага дня галасавання. Зваротаў і скаргаў у акруговую камісію не паступала.

У раёне зарэгістраваныя назіральнікі ад грамадскіх аб'яднанняў, якія пастаянна прысутнічаюць на пасяджэннях. Назіральнікі ад місіі СНД на выбарах 2024 года ў Беларусі наведалі Асіповіцкі раён упершыню. Разам з імі ўдзел у пасяджэнні прымалі назіральнікі ад Беларускага фонду міру, а таксама асобы, вылучаныя кандыдатамі ў дэпутаты ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і кандыдатамі ў дэпутаты па Глускай выбарчай акрузе № 45.

У ходзе пасяджэння былі агучаны падрабязнасці правядзення праверкі дакументаў у дзяржорганах, уручаны адпаведныя пасведчанні асобам, зарэгістраваным у якасці кандыдатаў у дэпутаты, і праведзена жараб'ёўка іх выступленняў у дзяржаўных масмедыя.

Міжнародныя назіральнікі адзначалі добры ўзровень правядзення электаральнай кампаніі, заўваг і прэтэнзій ад іх не прагучала.

— Місія назіральніка ад СНД ставіць асноўную задачу ўдасканальваць выбарчы працэс і садзейнічаць паляпшэнню яго дэмакратычнасці, — заўважыў **міжнародны назіральнік Тактасун САБЫРАЎ**. — Работу мы ацэньваем станоўча, тыя патрабаванні, якія высоўвае выбарчае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, выкананыя. Спадзяюся, што выбары пройдуць у строгай адпаведнасці з заканадаўствам. Мы гэта дадаткова зафіксуем.

У планах назіральнікаў, у адпаведнасці з заканадаўствам, наведаць розныя выбарчыя ўчасткі, праманіторыць, наколькі выконваюцца патрабаванні.

— Уся інфармацыя будзе даводзіцца да штаба, а на наступны дзень пасля выбараў, 26 лютага, савет каардынатараў абагульніць гэтыя даныя і агучыць сваю заяву па выніках назіранняў, — дадаў **міжнародны назіральнік Ігар ГРАХОЎСКІ**. — Місія назіральнікаў фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаў — удзельніц СНД. Гэта людзі, якія маюць вопыт у выбарчых кампаніях, парламентарыі, дыпламаты, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. У электаральнай кампаніі будзе задзейнічана некалькі сотняў міжнародных назіральнікаў.

— У краіне ўжо знаходзіцца парадку 50 доўгатэрміновых назіральнікаў, а непасрэдна ў перыяд датэрміновага галасавання і дзень выбараў будуць прысутнічаць яшчэ і кароткатэрміновыя, — удакладніла **міжнародны назіральнік Алена ШАМАЛЬ**. — Безумоўна, для нас цікавы сённяшні фармат выбараў, таму што ўпершыню ў Беларусі праводзіцца адзіны дзень выбараў. І гэты вопыт будзе важны для таго, каб яго прааналізаваць і падзяліцца з іншымі дзяржавамі. Пасяджэнне камісіі прайшло вельмі спакойна, звяртае на сябе ўвагу падрабязнае дэталёвае агучванне той інфармацыі, якую павінны былі прадставіць кандыдаты ў Палату прадстаўнікоў. Уражанні вельмі станоўчыя. Звяртае на сябе ўвагу дакладнасць, зладжанасць, арганізаванасць і спакой. Быццам бы такая форма існавала заўсёды.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**